В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# Складаны сказ

**Складанымі** называюцца сказы, якія складаюцца з дзвюх ці некалькіх прэдыкатыўных частак (простых па форме сказаў), аб’яднаных у адно цэлае сэнсава, граматычна і інтанацыйна.

## Асноўныя віды складаных сказаў

- Складаныя сказы
  - бяззлучнікавыя
  - злучнікавыя
    - складаназлучаныя
    - складаназалежныя
  - з рознымі відамі сувязі

## Складаназлучаныя сказы

**Складаназлучаныя** — гэта такія складаныя сказы, у якіх прэдыкатыўныя часткі раўнапраўныя па сэнсе і звязаны злучальнымі злучнікамі.

| Сэнсавыя адносіны паміж часткамі | Прыклады |
|---|---|
| 1. Спалучальныя:<br>а) адносіны адначасовасці з’яў і падзей (і, ды (=і));<br>б) адносіны паслядоўнасці з’яў і падзей (і, ды (=і)). | Маўчала возера ў тумане, ды вербы плакалі ў цішы (П. Трус).<br>Міхась іграць перастаў, і за ім змоўклі галасы і яго кампаньёнаў. |
| 2. Супастаўляльныя:<br>а) адносіны супастаўлення дзеянняў, з’яў, прымет (а, але, ды (=але), аднак);<br>б) адносіны неадпаведнасці з’яў, падзей, прымет (а, аднак). | Граў Сымонка, а дзед слухаў (Я. Колас).<br>Служы яму ты ўсёй душою, а сам ты хоць жабруй зімою (Я. Колас). |
| 3. Пералічальна-размеркавальныя:<br>а) пералічальныя адносіны аднолькава магчымых з’яў і падзей (і—і, ні—ні, то—то);<br>б) размеркавальныя адносіны, калі падзеі, з’явы ўзаемна выключаюць адна другую (або, або—або, ці, ці—ці, не то — не то) | То мароз марозіць, то золіць слата (Я. Купала).<br>Ці то стогне бура, ці то віхор гуляе (Я. Купала). |



© ТДА «Аверсэв»

| Сэнсавыя адносіны паміж часткамі | Прыклады |
|---|---|
| 4. Прычынна-выніковыя адносіны (і) | Тут пад'ехала хурманка, і хата апусцела (К. Чорны). |

## Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе

| Знак прыпынку | Умовы пастаноўкі | Прыклады |
|---|---|---|
| коска (найчасцей) | паміж часткамі, якія звязаны злучнікамі і, ды, а, але, ці, або, і—і, ні—ні, то—то, ці—ці, не то — не то, аднак, затое | Дрыжаць у золаце асіны, і гнуцца кісці верабіны (Я. Колас). Цяпер камінак спачывае, а хату лямпа асвятляе (Я. Колас). |
| кропка з коскай | калі часткі даволі разгалінаваныя, маюць свае знакі прыпынку, вызначаюцца пэўнай самастойнасцю | А лес, як добры той знаёмы, стаіць збялелы, нерухомы абапал рэчачкі сцяною, над ёю сплёўшыся страхою, далёка кінуўшы галінкі; а маладзенькія ялінкі пад белым пухам чуць заметны (Я. Колас). |
| працяжнік | калі часткі з прычынна-выніковымі адносінамі і лагічна падкрэсленым вынікам; пры рэзкім супастаўленні | Настане ноч — і ўсюды ціха (Я. Колас). |

**Коска не ставіцца:**

1) калі часткі маюць агульныя для іх члены: Шыбуюць гусі ў край далёкі і жураўлі ў той самы край (Я. Колас);

2) калі часткі маюць форму пытальных, пабуджальных або клічных сказаў; безасабовых ці няпэўна-асабовых сказаў: Як жа жывуць вашы браты і чым яны займаюцца? Патрошку цямнела і веяла восеньскім халадком;

3) калі ёсць агульная даданая частка:

калі? калі?

Ледзь толькі разднела, нас пасадзілі ў машыну і мы паехалі ў пушчу.



© ТДА «Аверсэв»

# Складаназалежныя сказы

**Складаназалежнымі** называюцца такія складаныя сказы, у якіх адна прэдыкатыўная частка звязана па сэнсе з другой пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ці злучальных слоў.

| Від даданай часткі | Што паясняе ў галоўнай частцы | На якія пытанні адказвае | Злучнікі і злучальныя словы | Прыклады |
|---|---|---|---|---|
| 1. Дзейнікавая | дзейнік (той, кожны, усякі, усё); выказнік (здавацца, успамінацца, невядома, добра і да т. п.) | хто? што? | хто, што, дзе, калі, які, чый, каб, як і інш. | Той, хто дружбы шукае, у нас знойдзе яе (М. Танк).<br><br>Не дзіўна, што Віктар ахвотна згадзіўся пайсці ў тэхнікум механізацыі (І. Дуброўскі). |
| 2. Выказнікавая | выказнік (такі, такая, такое, той, тая, тое, гэтакі, гэтакая, гэтакае) | які іменна? хто іменна? што іменна? | хто, што, які, каторы, чый, як, каб і інш. | Мароз такі, што скоўвае дыханне (А. Звонак). Якое пытанне, такое і адпавяданне. |

© ТДА «Аверсэв»

| Від даданай часткі | Што паясняе ў галоўнай частцы | На якія пытанні адказвае | Злучнікі і злучальныя словы | Прыклады |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| 3. Азначальная | назоўнік, займеннік (той, такі, гэты, гэтакі) | які? якая? якое? якія? | які, што, дзе, куды, адкуль, калі, як бы і інш. | Апознены месячык загарэўся за тым панурым лесам, што стаяў з боку чыгункі (Я. Колас). |
| 4. Дапаўняльная | выказнік, дапаўненне (той, кожны, усякі, усе, усё), акалічнасць (дзеепрыслоўе) | пытанні ўскосных склонаў | хто, што, які, чый, дзе, куды, адкуль, як, калі і інш. | Чалавек меў радасць ад усяго таго, што рабіў кожны дзень (К. Чорны). Ніхто з дамашніх не згадае, чым рэчка Костуся займае (Я. Колас). |
| 5. Акалічнасная *месца* | дзеяслоў, прыслоўе (там, туды, адтуль, адсюль і інш.) | дзе? куды? адкуль? | дзе, куды, адкуль | Там жыццё рай, дзе свабоды край (Прыказка). |



© ТДА «Аверсэв»

| Від даданай часткі | Што паясняе ў галоўнай частцы | На якія пытанні адказвае | Злучнікі і злучальныя словы | Прыклады |
|---|---|---|---|---|
| Акалічнасная *часу* | дзеяслоў, прыслоўе (у ролі акалічнасці) | калі? з якога часу? да якога часу? | калі, як, пакуль, як толькі, ледзь толькі і інш. | Як толькі выходны дзянёк настае, ён вуды і снасці збірае свае (П. Глебка). |
| Акалічнасная *ўмовы* | усю галоўную частку | пры якой умове? | калі, каб, як, раз | Калі старанна косяць, то сена зімою не просяць (Прыказка). |
| Акалічнасная *прычыны* | усю галоўную частку | чаму? па якой прычыне? | бо, што, таму што і інш. | Алена, каб не разбудзіць бацьку, рабіла ўсё ціха, асцярожна (А. Кулакоўскі). |
| Акалічнасная *мэты* | усю галоўную частку | для чаго? з якой мэтай? | каб, для таго каб, абы і інш. | Каб паслухаць жывую прыроду, трэба раненька ўстаць на зары. |
| Акалічнасная *ўступкі* | усю галоўную частку | нягледзячы на што? | хоць, хай (няхай), нягледзячы на тое што, як ні | Мы хадзілі, мы шукалі, кожны кусцік аглядалі, — хоць бы дзе адзін грыбок (П. Глебка). |

© ТДА «Аверсэв»

| Від даданай часткі | Што паясняе ў галоўнай частцы | На якія пытанні адказвае | Злучнікі і злучальныя словы | Прыклады |
|---|---|---|---|---|
| Акалічнасная *спосабу дзеяння* | указальнае слова *так* (у ролі акалічнасці) | як? якім чынам? | што, як, каб, аж, нібы, бы, быццам і інш. | Усё зацвіло, загаманіла, бы жыватворчая тут сіла ад сну прыроду абудзіла (Я. Колас). |
| Акалічнасная *выніку* | усю галоўную частку | у выніку чаго што адбылося? | так што, у выніку чаго, то, дык, аж | Белыя хмаркі з'явіліся на гарызонце, так што зрэдку яны закрывалі сонца. |
| Акалічнасная *меры і ступені* | указальныя словы *так*, *столькі*, *такі*, *да такой ступені* і інш. | у якой меры? у якой ступені? да якой ступені? | што, як, колькі, аж, ажно, каб, абы | Ціха, глуха ў лесе, хоць бы гук адзін (Я. Колас). Зор высыпала столькі, што праз іх не відаць было самога неба (Б. Сачанка). |
| Акалічнасная *параўнальная* | усю галоўную частку | як што? як хто? чым што? чым хто? | як, нібы, быццам, як быццам, як бы, чым і інш. | Густа ўсыпана снегам зямля, быццам хлеба акраец пасолен (А. Звонак). Чым вышэй падымалася сонца, тым весялейшымі былі галасы птушак. |



© ТДА «Аверсэв»

# Знакі прыпынку ў складаназалежным сказе з адной даданай часткай

| Знак прыпынку | Умовы пастаноўкі | Прыклады |
|---|---|---|
| коска | звычайна даданая частка аддзяляецца ад галоўнай, калі знаходзіцца перад ёй ці пасля яе; калі яна ў сярэдзіне галоўнай — коскі ставяцца з двух бакоў | А ноч не знае, што зараз бура зашуміць (Я. Колас).<br>Якое поле, такое і раздолле. Вільготныя жыты, што паабапал дарогі, дзе-кольвечы пазгіналіся пад грузам калосся (І. Пташнікаў). |
| коска і працяжнік | калі галоўная або даданая частка развітыя і маюць свае знакі прыпынку, можа ставіцца коска з працяжнікам | Затое ж тут, дзе яно [жытцо] буйнае, дзе яно густое, — надта хараша! (М. Гарэцкі). |
| працяжнік | калі часткі маюць розную інтанацыю, лагічна выдзяляецца даданая частка ці падкрэсліваецца сэнсавае супрацьпастаўленне, можа ставіцца працяжнік | А чаму неразумна і горка — было няясна (Я. Брыль).<br>Хто служыў бацькаўшчыне — той навекі ў памяці народа. |
| двукроп'е | калі паміж часткамі можна ўставіць а іменна ці даданая раскрывае сэнс слова адно ў галоўнай | Я не разумею: чаму няма ладу ў нашай працы.<br>Мама ўсім сваім выглядам пытала: калі я стану дарослым. |



© ТДА «Аверсэв»

# Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі

Дзве ці больш даданых частак па-рознаму суадносяцца паміж сабой і ўтвараюць чатыры асноўныя тыпы падпарадкавання.

| Тып падпарадкавання | Прыклад | Схема |
|---|---|---|
| 1. Паслядоўнае | [1] Усё ў тым краі сэрцу міла,<br>[2] Бо я люблю край родны мой,<br>[3] Дзе з першым шчасцем я спазналась<br>І з гора першаю слязой (К. Буйло). |  |
| 2. Сузалежнае аднароднае | [1] Люблю наш край — старонку гэту,<br>[2] Дзе я радзілася, расла,<br>[3] Дзе першы раз пазнала шчасце,<br>Слязу нядолі праліла (К. Буйло). |  |
| 3. Сузалежнае неаднароднае | [1] Калі зямля пачынала дыхаць цяплом і выглядаць з-пад снегу шэрымі плямкамі, [2] дзеці ладзілі шпакоўні, [3] каб сустрэць прылёт шпакоў. |  |
| | [1] Люблю зіму з яе марозам,<br>[2] Што вокны прыбярэ ва ўзор,<br>[1] І белы снег, [3] што, ўкрыўшы поле,<br>Ірдзіцца бляскам ясных зор (К. Буйло). |  |



© ТДА «Аверсэв»

| Тып падпарадкавання | Прыклад | Схема |
|---|---|---|
| 4. Камбінаванае (з сузалежным і паслядоўным падпарадкаваннем) | [1] Мой дом усюды, [2] дзе купал неба родны, [3] дзе гучаць па-народнаму сакавіта беларускія песні, [4] што кранаюць душу. |   |

## Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі

| Знак прыпынку | Умовы пастаноўкі | Прыклады |
|---|---|---|
| коска | калі даданыя часткі ў аднолькавай ступені адносяцца да галоўнай часткі | Стаяла ранняя вясна, калі зацвіталі вербы, калі рэчкі яшчэ не ўвайшлі ў свае берагі. |
| кропка з коскай | калі даданыя часткі маюць развітую будову (часам са сваімі знакамі прыпынку) і інтанацыйна аддзяляюцца адна ад адной | Ніхто не знаў тых струн, патайных ніцей душы, што злучаюць гук пярунаў з немым голасам цішы; бо і ў той цішы зацятай ёсць і голас, і свой твар, разнастайны і багаты, поўны музыкі і чар (Я. Колас). |
| працяжнік | калі даданыя часткі стаяць перад галоўнай, вымаўляюцца з узмоцненай інтанацыяй | Калі чалавеку, які табе дарагі, блага — для яго зробіш усё (І. Шамякін). |



© ТДА «Аверсэв»

<table>
<tr><th>Знак прыпынку</th><th>Умовы пастаноўкі</th><th>Прыклады</th></tr>
<tr><td>двукроп'е</td><td>калі дададзеная частка выдзяляецца лагічна (можна ўставіць словы а іменна)</td><td>На зіму ласяня паставілі ў невялікую загарадку ў хляве, да якога ён доўга не мог прывыкнуць: бо нешта мулял суседства з каровай і свіннямі (І. Далідовіч).</td></tr>
<tr><td colspan="3">• Калі даданыя часткі звязаны адзіночнымі злучнікамі і, ці, або, то коска паміж імі не ставіцца: Мяне ўжо радуе і тое, што ночка стала ўбываць і што ад мёртвага спакою пачне прырода ажываць (Я. Колас).<br>• Калі і, ці, або паўтараюцца, то коска ставіцца так, як і пры аднародных членах сказа</td></tr>
</table>

## Бяззлучнікавыя складаныя сказы, знакі прыпынку ў іх

**Бяззлучнікавымі** называюцца такія складаныя сказы, у якіх прэдыкатыўныя часткі звязаны па сэнсе і інтанацыйна без злучнікаў і злучальных слоў.

| Знак прыпынку | Умовы пастаноўкі | Прыклады |
|---|---|---|
| коска | калі паміж часткамі адносіны адначасовасці ці паслядоўнасці | Замірае лета, заціхаюць далі, сірацее рэчка, халадзеюць хвалі (Я. Колас). |
| кропка з коскай | калі часткі развітыя, маюць менш цесную сэнсавую сувязь, свае знакі прыпынку | Рэчкі бурлівыя, учора санлівыя, сёння ўсталі, плывуць і бурляць; рыбкі шмыглівыя скачуць, купаюцца, к небу прыветна з вадзіцы глядзяць (Я. Купала). |



© ТДА «Аверсэв»

| Знак прыпынку | Умовы пастаноўкі | Прыклады |
|---|---|---|
| працяжнік | калі адбываецца хуткая змена падзей, нечаканы вынік (можна ўставіць злучнік і) | Ударыў дзед абухам — елка загула (Я. Колас). |
| | калі змест частак супрацьпастаўляецца (можна ўставіць а, але) | Каса не косіць — каса брые (Я. Колас). |
| | калі другая частка паказвае на вынік таго, пра што гаворыцца ў першай (можна ўставіць тады) | Павее ветрык — шурхнуць травы (Я. Колас). |
| | калі паміж часткамі адносіны часу ці ўмовы (перад першай часткай можна ўставіць злучнік калі) | Снег на куццю — грыбы на лета. А сцежкі чорны — ягад многа (Я. Колас). |
| | калі паміж часткамі адносіны параўнання (можна ўставіць быццам) | У воду войдзеш — шчасце рая (Я. Колас). |
| | калі апошняя частка падагульняе змест папярэдніх | Вось у гушчары захрумсцеў сушняк, на лёд і леташняе лісце сыпанула шыгалле — на прагулку з'явіўся алень (В. Карамазаў). |
| двукроп'е | калі другая частка выражае прычыну таго, пра што гаворыцца ў першай | Добра ў полі: волі многа і прастору-шырыні, вабяць далі там малога, як прынадныя агні (Я. Колас). |
| | калі другая частка паясняе, раскрывае змест першай | Я так бы раіў: выбраць час і аглядзець усё зараз (Я. Колас). |



© ТДА «Аверсэв»

| Знак прыпынку | Умовы пастаноўкі | Прыклады |
|---|---|---|
| двукроп'е | калі другая частка дапаўняе, удакладняе змест першай (можна ўставіць што, як) | Надвор'е было жудасным: вецер выў, мокры снег валіў камякамі. |
| | калі другая частка — прамое пытанне | Не раз прыходзіла думка: чаму гэта ў яе сяброўак надоі вышэйшыя? |
| | першая частка абагульняе змест наступных | Так і ў жыцці: бягуць часіны, ліхія, добрыя хвіліны, адна змяняецца другою (Я. Колас). |

## Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі

| Віды сувязі і прыклады | Схема |
|---|---|
| 1. Злучальная і падпарадкавальная:<br>[1] Заміраў тады хлапчына, [2] і здавалася яму, [3] што ён знае, [4] як травінка сваю думае думу (Я. Колас). | што? што?<br>$[^{1}\ ]$ і $[^{2}\ ]$, $(^{3}$ што...), $(^{4}$ як...) |
| 2. Бяззлучнікавая і злучальная:<br>[1] Я сядзеў ля акна і пазіраў на вуліцу: [2] свяціла сонца, [3] і на дрэвах, парканах, дахах пераліваўся залатымі іскрамі снег. | $^{I}[^{1}\ ]$: $^{II}$ $[^{2}\ ], [^{3}]$ |
| 3. Бяззлучнікавая і падпарадкавальная:<br>[1] І ў непагадзь і ў ясную пагоду да болю адчуваю кожны раз: [2] мы ўсе з таго няскоранага роду, [3] што чыстым хлебам шчодра корміць нас (С. Грахоўскі). | якога?<br>$^{I}[^{1}\ ]$: $^{II}$ $[^{2}\ \times]$, $(^{3}$ што...) |



© ТДА «Аверсэв»

| Віды сувязі і прыклады | Схема |
| --- | --- |
| 4. Бяззлучнікавая, злучальная і падпарадкавальная: [1] Шуміць авёс, [2] звініць ячмень, [3] і верыш ты ахвотна, [4] што каласы цалюткі дзень красуюць бесклапотна (А. Куляшоў). | I [1 ], [2 ] і II [3 ×], (4 што ...) у што? |

## Сінтаксічны разбор складанага сказа

### Парадак разбору

1. Вызначыць колькасць і граматычную аснову ўсіх частак сказа.

2. Вызначыць від сувязі частак сказа (злучнікавая ці бяззлучнікавая).

3. Калі сказ злучнікавы, вызначыць яго тып (складаназлучаны ці складаназалежны).

4.1. У складаназлучаным сказе: вызначыць, якім злучальным злучнікам звязаны прэдыкатыўныя часткі (спалучальны, супраціўны, размеркавальны), якія сэнсавыя адносіны выражаюцца паміж часткамі (адначасовасці, паслядоўнасці, супастаўлення, неадпаведнасці, пералічальныя, размеркавальныя, прычынна-выніковыя).

4.2. У складаназалежным сказе: назваць галоўную і даданую (даданыя) часткі, вызначыць від даданай часткі, сродкі сувязі (злучнікі ці злучальныя словы). Калі некалькі даданых частак, вызначыць тып падпарадкавання (паслядоўнае, сузалежнае аднароднае ці неаднароднае, камбінаванае).

4.3. У бяззлучнікавым сказе: назваць прэдыкатыўныя часткі, вызначыць адносіны паміж часткамі (адначасовасці, паслядоўнасці, супрацьпастаўлення, часу ці ўмовы, параўнання, прычыны).

4.4. У сказах з рознымі відамі сувязі: назваць колькасць прэдыкатыўных частак, вылучыць логіка-структурныя блокі (адзін з іх будзе складаным сказам).

5. Ахарактарызаваць кожную прэдыкатыўную частку (сінтаксічны разбор).

6. Растлумачыць знакі прыпынку.

7. Скласці схему сказа.



© ТДА «Аверсэв»

## Узоры разбору

### Складаназлучаны сказ

[1] Я хлеба ў багатых прасіў і маліў, [2] яны ж мне каменні давалі (М. Багдановіч).

Складаны сказ, складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак, граматычныя асновы я прасіў, маліў і яны давалі, злучнікавы, складаназлучаны, часткі звязаны пры дапамозе супраціўнага злучніка ж, паміж часткамі адносіны супастаўляльныя.

Характарыстыка прэдыкатыўных частак (гл. узор разбору простага сказа, с. 151). Паміж часткамі ставіцца коска.

Схема сказа: [1], ж [2].

### Складаназалежны сказ

[1] І песню родную люблю я, [2] што дзеўкі ў полі запяюць (К. Буйло).

Складаны сказ, складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак, граматычныя асновы я люблю і дзеўкі запяюць, злучнікавы, складаназалежны, часткі звязаны пры дапамозе злучальнага слова што, паміж часткамі выражаны азначальныя адносіны.

Характарыстыка прэдыкатыўных частак (гл. узор разбору простага сказа, с. 151).

Дададная частка аддзяляецца ад галоўнай коскай.

Схема сказа: [1 ×], (2 што ...). (якую?)

### Бяззлучнікавы сказ

[1] Лес туманам заснаваўся, [2] луг расой абмыўся (Я. Колас).

Складаны сказ, складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак, граматычныя асновы лес заснаваўся і луг абмыўся, бяззлучнікавы, паміж часткамі выражаны супастаўляльныя адносіны.

Характарыстыка прэдыкатыўных частак (гл. узор разбору простага сказа, с. 151).

Адна частка ад другой аддзяляецца коскай.

Схема сказа: [1], [2].

### Складаны сказ з рознымі відамі сувязі

[1] Прыпякала яшчэ мацней, [2] і парнасць, [3] што насычала паветра, [2] была цяжкай і духмянай (Т. Хадкевіч).



© ТДА «Аверсэў»

Складаны сказ, складаецца з трох прэдыкатыўных частак, граматычныя асновы прыпякала, парнасць была цяжкай і духмянай, што насычала, злучнікавая (злучальная і падпарадкавальная), складаны сказ з рознымі відамі сувязі, першы структурны блок — першая прэдыкатыўная частка, другі — другая і трэцяя прэдыкатыўная часткі.

Характарыстыка прэдыкатыўных частак (гл. узор разбору простага сказа, с. 151).

Часткі адна ад другой аддзяляюцца коскамі.

Схема сказа: I [1] і II [2 ... ×, (3 што...) ...]. (якая?)

# Знакі прыпынку пры простай мове

## 1. Простая мова пасля слоў аўтара

| | |
|---|---|
| А: «П». | Лёнік сказаў: «Зараз я пачастую цябе смачнымі яблыкамі». |
| А: «П?» | Я запытаўся ў яго: «А дзе ж ваша брыгада?» (Я. Скрыган). |
| А: «П!» | Юхневіч гукнуў весела: «Што я табе, Адаме, казаў!» (А. Савіцкі). Асташонак закамандаваў: «Досыць, старшыня!» (А. Савіцкі). |

## 2. Простая мова перад словамі аўтара

| | |
|---|---|
| «П», — а. | «На мяжы фантастыкі, як і трэба ў касмічны век», — нібыта пажартаваў дзядзька (П. Місько). |
| «П?» — а. | «А чыя ж то скрыпка гэта?» — зноў спытаўся гаспадар (Я. Колас). |
| «П!» — а. | «Дзякуй вам за падвячорак!» — кажа ён гаспадарам (Я. Колас). |



© ТДА «Аверсэв»

## 3. Простая мова разрываецца словамі аўтара

| | |
|---|---|
| «П, — а, — п». | «Ага, — гаворыць ён, — я ж тады і не сказаў пра спаборніцтва» (Я. Скрыган). |
| «П, — а: — П». | «От што, хлопцы, — кажа ён, пагадзіўшы, і дадае: — Віка добрая, гэта нічога, што яна здаецца вільготнай» (Я. Скрыган). |
| «П! (?) — а. — П». | «Эх, блазнота! — усміхнуўся дзед. — Прысядзь, паслухай, што я табе раскажу». |

## 4. Простая мова паміж словамі аўтара

| | |
|---|---|
| А: «П», — а. | Лёнік сказаў: «Я сёння, можа, яшчэ раз прыйду», — і ўзяў два пахучыя чырвона-жоўтыя яблыкі. |
| А: «П! (?)» — а. | Самсонаў прамовіў: «Курортныя ў вас тут мясціны, хлопцы!» — і пайшоў да рэчкі. |
| А: «П...» — а. | Гайтар усміхнуўся: «Чым за морам віно піць, лепш з Нёмана вадзіцу...» — і павёў гамонку пра вёску. |

© ТДА «Аверсэв»